ЗАЦВЯРДЖАЮ
Галоўны спецыяліст аддзела па адукацыі
Докшыцкага райвыканкама

А.А.Кучыц

_______________2025 г.

УМОВЫ
правядзення раённага этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі

## МЭТА І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

У адпаведнасці з пісьмом галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага абылвыканкама ад 21.01.2025 № 01-01-37/101 з мэтай фарміравання ў навучэнцаў грамадзянска-патрыятычных пачуццяў сродкамі экскурсійнай музейнай дзейнасці праводзіцца раённы этап рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі (далей – конкурс).

Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляюцца:

фарміраванне ў дзяцей і моладзі каштоўнасных арыенціраў, гонару і павагі да гісторыі і культуры малой радзімы;

папулярызацыя гісторыка-культурных і прыродных адметнасцей малой радзімы сродкамі экскурсійнай дзейнасці;

папулярызацыя дзейнасці музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі;

выяўленне і заахвочванне лепшых юных экскурсаводаў музеяў/музейный пакояў устаноў адукацыі;

развіццё творчых здольнасцей, садзейнічанне прафесійнаму самавызначэнню навучэнцаў, набыццё камунікатыўных навыкаў праз экскурсійную дзейнасць.

## АРГАНІЗАТАРЫ

Арганізатарамі раённага этапу з'яўляецца аддзел па адукацыі Докшыцкага раённага выканаўчага камітэта і ДУДА "Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі". Агульнае кіраванне ажыццяўляе ДУДА "Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі"

## УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

Удзельнікамі конкурсу з’яўляюцца навучэнцы агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі ва ўзроставай катэгорыі ад 13 гадоў да 18 гадоў (юныя экскурсаводы музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі (індывідуальна).

## ТЭРМІНЫ І АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца ў перыяд са студзеня па люты 2025 года ў два туры.

Першы тур пройдзе ў завочным фармаце.

Другі тур вочны – 22 лютага 2025 года.

На першы тур ад удзельнікаў конкурсу музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі неабходна:

– ад юных экскурсаводаў музеяў прадставіць відэа, у якім яны прэзентуюць перад гледачамі музей сваёй ўстановы адукацыі адпаведна профілю (да 7-мі хвілін);

– ад юных экскурсаводаў музейных пакояў прадставіць відэаролік аглядальнай экскурсіі па музейным пакоі адпаведна профілю (да 5-ці хвілін).

Юныя экскурсаводы ў форме рэкламы знаёмяць з музеем/ музейным пакоем установы адукацыі, з іх адметнасцямі і ўнікальнасцю. Колькасць аб’ектаў падчас правядзення экскурсіі не абмяжоўваецца. Пры правядзенні экскурсіі могуць выкарыстоўвацца розныя мастацкія сродкі эмацыйнага ўздзеяння (касцюмы, музычнае суправаджэнне і інш.).

У відэаролiку дапускаецца выкарыстанне пры мантажы і здымцы відэаэкскурсіі спецыяльных праграм і інструментаў. Тэхнічныя параметры відэароліка: фармат – avi, mpg, wmv. Відэаролік павінен утрымліваць звесткі пра музейны пакой установы адукацыі і яго профіль, а таксама дадзеныя юнага экскурсавода.

Конкурсныя матэрыялы і заяўкі дасылаюцца да 15 лютага 2025 года ў ДУДА “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”. Прагляд конкурсных відэаматэрыялаў 1 тура адбудзецца 17-18 лютага 2025 года.

У другім туры юныя экскурсаводы музеяў вочна прадстаўляюць і абараняюць прэзентацыю агляднай экскурсіі па музею ўстановы адукацыі адпаведна профілю (да 7-мі хвілін).

Пры праглядзе відэаролікаў аглядальнай экскурсіі па музейным пакоі канкурсанты павінны быць гатовы адказваць на пытанні журы па тэме сваёй прадстаўленнай экскурсіі.

Потым усе ўдзельнікі конкурсу прадстаўляюць тэматычную экскурсію ”Музей у чамадане“ (да 5-ці хвілін) па тэме “Вялікай Перамозе – 80”.

Асноўныя крытэрыі ацэнкі:

- адпаведнасць агляднай (ці тэматычнай) экскурсіі;
- змястоўнасць, інфарматыўнасць;
- лагічнасць пераходаў для аб'яднання матэрыялу экскурсіі ў адзінае цэлае;
- прыцягненне ўвагі да музея, наяўнасць у экскурсіі элементаў рэкламы;
- спалучэнне паказа і расказа;
- культура мовы;
- займальнасць, крэатыўнасць, артыстызм;
- прытрымліванне хранаметражу.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

Пераможцы і прызёры раённага этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі будуць узнагароджаны па асобку за музей/ музейную комнату і за "Музей у чамадане" дыпломамі I, II, III ступені аддзела па адукацыі Докшыцкага райвыканкама.

Пераможцы будуць накіраваныя на абласны этап, дзе абарона работ юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі будзе праходзіць у вочным фармаце, а музейных пакояў у завочнай форме па ацэнцы прадстаўленых відэаролікаў.

## ФІНАНСАВАННЕ

Набыццё дыпломаў пераможцам і прызёрам раённага этапу рэспубліканскага конкурсу юных экскурсаводаў музеяў/музейных пакояў устаноў адукацыі (9 штук), падвоз вучняў, ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту прадугледжаных на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў.

Савулава 59791